# ПЯТНАЦЦАЦІГАДОВАЯ НЯВОЛЬНІЦА

## З успамінаў З.М. Лазарчык, в. Старынцы

... Зінаіда Міхайлаўна часта разглядвае здымкі ў фотаальбомах. «Гэта я ў Германіі. Пятнаццаць год усяго было, як забралі...», - уздыхае Зінаіда Міхайлаўна. Так я адкрыла для сябе яшчэ адну старонку жыцця гэтай цудоўнай працавітай жанчыны. Вось яе расказ.



***З.М. Лазарчык.***

... Стыў халодны люты 43-га. Нас тады, хлопцаў і дзяўчат, многа ўзялі са Старынцоў. Каго за сувязь з партызанамі, мяне - за тое, што брат Леанід быў падпольшчыкам. Шаснаццацігадовую Жэню Вішнеўскую забралі не адну, а з бацькамі, братам.

Як ехала ў тым вагоне-цялятніку, то думала, што ўсе вочы выплачу. Узіралася ў акно пад столлю - ледзь даставала да яго – і развітвалася з роднымі палямі, лясамі. Думалася, ніколі не вярнуся, не ўбачу свае Старынцы. Як цяжка гэта... І страшна. У Інстэнбург нас прывезлі, што ва Усходняй Прусіі. Помню, як хадзіла нямецкая фрау, выбірала рабочую сілу. Я ёй прыглянулася, бо не па гадах крэпкая была. Паказвае: умееш каровы даіць? «Не», - махаю галавою. Але яна ўсё - роўна забрала мяне. І вось - маёнтак. Шмат зямлі, жывёлы. Даяраў двое было, я і хлопец - паляк. Ён ужоналаўчыўся, бо даўно даіў. Падымала гаспадыня ранютка. І сёння ў вушах той яе крык: «Аўфштэйн!». А як жа хочацца спаць у пятнаццаць год на світанку! Бывала, пад каровай засну, і тады зноў вокрык. Вы не паверыце, але цэлы рок не заснула ні адной ночы. Чаму? Гэтак балелі рукі. Не магла знайсці ім месца - шугала іх і гладзіла, і плакала ад болю і крыўды. А наранку ўстаеш - і зноў вядро ў рукі, і доіш 10, а то і 15 кароў. Яны летам суткамі на полі былі, і даілі мы іх там тры разы на дзень, і малако цадзілі, і посуд мылі.

А ў свабодны ад дойкі час ў полі працавалі, я яшчэ і гусей цэлыя статкі карміла: намяшаю цеста, нараблю з яго сукачыкаў і пхаю ім у горла.

Нас жа, парабкаў, кармілі так, каб толькі з голаду не памерлі. Але ні голад, ні холад - і ўзімку, і летам хадзіла ў драўляных клумпах - не былі такімі страшнымі, як туга па радзіме.

... Я слухаю Зінаіду Міхайлаўну і цішком выціраю слёзы. Вясковае дзіця больш двух гадоў правяло на чужыне, у цяжкай паднявольнай працы. А дома яе чакала гора: не вярнуўся з фронту брат. Бацька ж памёр, калі Зінаіда была яшчэ маленькай, маці хварэла. І адпачыць пасля працы ў Германіі дзяўчыне не было калі: чакалі поле, плуг, цэп. А ўвогуле, работы ёй хапала заўсёды. «Пад такой зоркай нарадзілася», - уздыхае Зінаіда Міхайлаўна. І дадае: «Але паднявольная праца - гэта вельмі цяжка. Няхай ніхто ніколі не зведае яе, няхай не будзе больш на нашай зямлі вайны».



***З.М. Лазарчык.***

Пасля вайны Зінаіда Міхайлаўна Лазарчык, была цестамесам на хлебапякарні ў райцэнтры. Ды якім цестамесам! Вяскоўцы казалі: «Мусіць, сайкі сёння ты, Зіна, мясіла, бо гэткія ўжо смачныя, гэткія пышныя!» У Зінаіды Міхайлаўны беражліва захоўваецца ў шафе строгі касцюм з ордэнам «Знак Пашаны» і шматлікія граматы за старанную працу. Фотаздымак яе красаваўся на Дошцы Гонару прадпрыемства.

Жыве яна ў невялікай пашаляванай хаціне, убранай цудоўнымі посцілкамі, абрусамі і вышыванкамі яе работы.. Жанчына жыве адна, лёс не падараваў ёй сям'і, дзяцей. І ўсё ж такі яна па-своему шчаслівая: яна перажыла ўсе нягоды і вярнулася з той няволі жывай. А магло быць інакш.

Марыя Драпеза, в. Старынцы,
2005 год.